УДК 796:373.5

# ДА ПЫТАННЯ АБ ЯКАСЦІ ВЫКАНАННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

**Углікаў С.А., ст. выклад., Кучарава А.А., выклад.**
*Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова, г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь*

Адукацыйная задача вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі прадугледжвае набыццё школьнікамі рухальных уменняў і навыкаў, спосабаў дзейнасці, якія складаюць змест вывучаемых відаў спорту, з мэтай аздараўлення і фарміравання фізічнай культуры асобы. Праграмай прадугледжана вывучэнне вучэбных матэрыялаў базавага і варыятыўнага кампанентаў «Веды» і «Асновы відаў спорту», якія ўключаюць вывучэнне праграмных тэм (лёгкая атлетыка, гімнастыка і акрабатыка, лыжная падрыхтоўка, спартыўныя гульні і інш.) [1].

Спецыфіка прадмета «Фізічная культура і здароўе» прадугледжвае канцэнтрычны спосаб пабудовы працэсу адукацыі, які ажыццяўляецца праз паўтарэнне матэрыялу з яго ўскладненнем і ўзбагачэнне зместу навучання новымі кампанентамі. Вынікам такога працэсу павінен стаць выпускнік (абітурыент), выразна арыентаваны на далейшую прафесійную дзейнасць у сферы фізічнага выхавання, на засваенне праграмы вышэйшай адукацыі ўстаноў адпаведнага профілю на аснове раней атрыманых навыкаў, з пэўным узроўнем фізічнай падрыхтоўкі. Аднак апошнім часам выкладчыкамі ВНУ



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адзначаецца агульнае зніжэнне ўзроўню як фізічнай падрыхтаванасці выпускнікоў школ, так і тэхнічнага складніка іх навыкаў і ўменняў, што патрабуе ад прафесарска-выкладчыцкага складу дададковых намаганняў у працэсе падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў, унясення незапланаваных змен у навучальны працэс. Сёння гэта становіцца нормай.

Намі праведзена работа па высвятленні прычын зніжэння ўзроўню базавай падрыхтоўкі ўчарашніх школьнікаў праз анкетаванне студэнтаў факультэта фізічнага выхаванні дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі па адным з раздзелаў школьнай вучэбнай праграмы па прадмеце «Фізічная культура і здароўе» пры вывучэнні тэмы «Гімнастыка і акрабатыка». У апытанні прынялі ўдзел 95 чалавек.

Вынікі апытання дэманструюць недахопы пазначанай праблемы. Толькі 11 % рэспандэнтаў упэўненыя ў тым, што добра ўяўляюць сабе змест вучэбнай праграмы па тэме «Гімнастыка і акрабатыка», каля 51 % маюць фрагментарнае ўяўленне пра гэта. Толькі 40 % апытаных здолелі правільна адказаць, у якой чвэрці гэты матэрыял выкладаецца ў школе. Асобна варта спыніцца на сістэматычнасці правядзення ўрокаў па дадзенай тэме. Крыху больш за 28,6 % студэнтаў пацвердзілі рэгулярнасць правядзення заняткаў на першай і другой ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, 34,3 % указалі на іх адсутнасць наогул і 37,1 % – на частковае іх правядзенне. Яшчэ больш несуцяшальныя вынікі зафіксаваны ў дачыненні да старшых класаў: 71,4 % рэспандэнтаў указалі на замену вучэбнага матэрыялу па гімнастыцы і акрабатыцы іншымі тэмамі базавай часткі «Асновы відаў спорту». Пры ацэнцы ўзроўню арганізацыі правядзення ўрокаў па гімнастыцы і акрабатыцы 45,7 % студэнтаў выставілі настаўнікам фізічнай культуры ад 1 да 3 балаў па пяцібальнай шкале, што характарызуе іх тэарэтычную, метадычную і фізічную падрыхтаванасць. Асноўнымі прыёмамі навучання гімнастыцы і акрабатыцы на ўроках у агульнаадукацыйных школах з'яўляюцца наступныя: 62 % складаюць страявыя прыёмы (перастраенні, перамяшчэнні), агульнаразвівальныя практыкаванні і элементы фігурнай маршыроўкі і толькі 38 % – практыкаванні на снарадах і акрабатычныя практыкаванні.

У заключэнні хацелася б спыніцца на рэйтынгу тэм вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Фізічнай культуры і здароўю» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, што ў сваю чаргу з'яўляецца паказчыкам матывацыйнай сферы сучасных школьнікаў. Паводле апытаных студэнтаў, урокі гімнастыкі і акрабатыкі знаходзяцца на чацвёртым месцы пасля урокаў па лёгкай атлетыцы, спартыўным і рухомым гульням, лыжнай падрыхтоўцы.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. – Мн., 2019.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова